*А. М. Нароўская,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,*
*г. Мінск*

# ВОБРАЗ СУСВЕТНАГА ДРЭВА Ў ПРАДМЕТНЫМ АСЯРОДДЗІ БЕЛАРУСАЎ

Сусветнае дрэва – міфалагічны вобраз, які ўвасабляе універсальную канцэпцыю будовы Сусвету. Як сведчаць літаратурныя крыніцы, вобраз дрэва прысутнічае паўсюдна ў чыстым выглядзе або ў варыянтах: дрэва жыцця, дрэва цэнтра, нябеснае дрэва, шаманскае дрэва, дрэва спазнання і г. д. У вобразе Сусветнага дрэва чалавек рэалізоўваў уяўленні аб прасторы і часе, арганізацыі калектыву. У пэўным сэнсе Сусветнае дрэва з’яўляецца мадэллю культуры ў цэлым.

Рэканструяваць выяву Сусветнага дрэва магчыма на аснове міфалагічных уяўленняў, зафіксаваных у разнастайных тэкстах, у тым ліку помніках архітэктуры (асабліва культавых) і традыцыйнага жылля, рэчаў, рытуалаў.

Па меркаванні У. М. Тапарова, выбар першабытным чалавекам у якасці мадэлі сусвету дрэва з’яўляецца невыпадковым. Міфалагізаваная свядомасць чалавека першабытнага ладу адухаўляла прыроду ў пошуках чагосьці больш даўгавечнага і менш падуладнага стыхіям, чым ён сам, не магла не звярнуцца да дрэва. Такая мадэль макрасферы ў выглядзе дрэва з’яўляецца ўніверсальнай выявай жыццяўладкавання (вертыкаль «галіны – ствол – карані» ўбірае ў сябе разнастайныя сэнсы – «неба – зямля – падземнае царства»; «мінулае – сучаснасць – будучае»; «галава – тулава – ногі»; «агонь – зямля – вада»; «птушкі – капытныя – пчолы – чалавек» і г. д.).

У беларускім фальклоры самае міфалагізаванае дрэва – дуб (мал. 1).



Мал. 1. Дуб-велікан (узрост 230 гадоў),
в. Вялікія Кругавічы, Ганцавіцкі раён, Брэсцкая вобласць

Вытокі гэтага знаходзяцца ў вераваннях старажытных славян, для якіх дуб з'яўляўся святым дрэвам грамавержца Перуна – галоўнага бога славянскага пантэона.

У праславянскай мове слова «дуб» азначала агульнае паняцце дрэва, гэта гаворыць аб тым, што сярод дрэў дуб шанаваўся больш за іншыя. Менавіта да дуба адносілі славяне паданні аб «Сусветным дрэве». Магчыма з гэтым была звязана забарона выкарыстання ў будаўніцтве дрэў, якія раслі ў свяшчэнных рошчах, не бралі таксама і старыя дрэвы, якія сваім доўгім векам атрымалі права на жыццё да старасці. У кнізе «Пережитки древнего миросозерцания белорусов» А. Я. Багдановіч пісаў: «У Барысаўскім павеце нам давялося чуць, што даўным-даўно каля старога Барысава, які некалі належыў князям Радзівілам … рос на адной палянцы "старадаўні дуб" вельмі вялікіх памераў. Калі хто, бывала, рубане яго тапаром, то абавязкова з тым здаралася няшчасце. А калі па загадзе ўладальніка ссеклі гэты дуб, то падаючы, ён раздавіў усіх, хто яго рубіў, і акрамя таго, цэлы тыдзень лютавала страшэнная бура, з перуном і маланкай, што прычынілі шмат бед» [2, с. 29]. Аб дрэве жыцця пісаў таксама фалькларыст А. М. Афанасьеў [1, с. 214].

Тое, што ў славянскай міфалогіі роля «дрэва жыцця» адведзена дубу, несумненна, і тлумачыцца яго магутнасцю і даў-

галеццем. Вобраз дрэва фігуруе ва ўсёй будаўнічай абраднасці беларусаў і іншых народаў. Так, паводле этнаграфічных дадзеных, будаўніцтва жылля пачыналася з вызначэння рытуальнага цэнтра. Звычайна такой кропкай была сярэдзіна будучага жылля ці покуць. Сюды ўстанаўлівалі маладое дрэўца або зроблены цесляром крыж, які стаяў да заканчэння будаўніцтва. Сувязь дрэўца (крыжа) з канцэпцыяй Сусветнага дрэва відавочная. Гэты сімвал надае міфалагічны сэнс не толькі будучай пабудове, але ж і працэсу будаўніцтва.

Па міфалагічных уяўленнях, найвышэйшай каштоўнасцю валодае тая кропка ў прасторы, дзе здзяйсняўся акт тварэння. Менавіта з ёй асацыіруецца сярэдзіна свету, менавіта тут знаходзіцца Сусветнае дрэва, якое з'яўляецца крыніцай жыцця. «Само Сусветнае дрэва у пэўных кантэкстах становіцца мадэллю культуры ў цэлым... Яно аддзяляе свет касмічны ад свету хаатычнага, уводзячы ў першы з іх меру, арганізацыю…» [6, с. 404]. Дзякуючы гэтым якасцям дрэва шырока выкарыстоўваецца пры асваенні «чужой» прасторы.

Сімвал Сусветнага дрэва надаваў міфалагічны сэнс будучай пабудове; будаўніцтва хаты становіцца ў адзін шэраг з іншымі падзеямі касмагенезу і дубліруе асноўную схему тварэння сусвету. Будаўніцтва, такім чынам, разглядалася міфалагічнай свядомасцю як працэс «уздзвіжання, вырастання і ў канчатковым выніку злучэння трох вертыкальных сфер, што асабліва актуальна ў сувязі з ідэяй Сусветнага дрэва» [6].

Вывучэнне такіх знакавых сістэм, як фальклор, міфалогія, мастацтва, выявіла шэраг класіфікатараў, з дапамогай якіх чалавек арыентаваўся ў навакольным свеце [4, с. 12]. Значэнне дрэва ў татэмічных класіфікацыях народаў свету, у тым ліку і беларусаў [3, с. 41–43], вельмі важнае. У этнаграфічных крыніцах даецца шмат матэрыялу пра культ дрэва, з якім быў звязаны комплекс вясновай абраднасці («куст», «майскае дрэва», «май»).

Семантычная сувязь дрэва і беларускага жылля ўвасобілася і ў афармленні святочнага інтэр'ера жылля. Так, на Сёмуху галінкамі вярбы («маем») упрыгожвалі сцены жылля ўнутры і звонку. Акрамя вярбы для сімвалічнага азелянення выкарыстоўвалі таксама галінкі бярозы, ліпы, рабіны і клёна. На Паня-

монні падлогу высцілалі яварам, а ў Заходнім Палессі – клёнам і бярозай*.

Неабходна акцэнтаваць увагу і на пячным слупе, які ў старажытныя часы ўстанаўліваўся ў цэнтры жылля і паступова перасунуўся бліжэй да печкі. Звычайна яго ў XIX – пачатку XX ст. ставілі на вуглу печы. Такі пячны слуп меў вялікае значэнне ў вясельнай абраднасці. Рэшткі архаічных вераванняў, звязаных з пячным слупам, захаваліся ў беларускай традыцыі, дзе ён называўся «дзедаў слуп», «конеў слуп» ці «конь». Слуп («стоўп») размяшчаўся каля печкі і ў старажытнасці быў адначасова ахвярнікам і свяшчэнным месцам, на якое станавіўся жрэц ці іншы выканаўца абрадаў.

Цікавы абрад быў зафіксаваны П. В. Шэйнам у в. Дворцы Рагачоўскага павета былой Магілёўскай губерні: «Калі малады прыязджаў пасля вянца са свайго дома да маладой, у хаце ўсе месцы за сталом былі занятыя. Малады вяртаўся ў панадворак, сядаў у павозку і пасылаў свата з біклагаю гарэлкі. Тут і адбываўся архаічны абрад. Маці маладой сядзела босая на пячным “стаўпе”. У чаканні свата яна пляла лапці, сват даваў ёй рубель “на боты” альбо гатовыя боты. Атрымаўшы падарунак, маці злазіла са слупа, абувалася і ішла за жаніхом» [7, с. 366–374].

Існавалі іншыя цікавыя абрады. Так, у апісанні з Барысаўскага павета згадвалася, што дружка жаніха, увайшоўшы ў хату, адзін пірог клаў на «стоўп каля печкі», а другі – на стол насупраць печкі, «на покуці». У апісанні з Віцебшчыны хросны бацька, які сядзеў на куце, падчас выканання «стаўбавой» песні адзін пірог клаў на бажніцу, а другі кідаў запявалу, які сядзеў на «стаўпе» [7, с. 229–231].

Вобраз Сусветнага дрэва можна сустрэць таксама ў прадметным асяроддзі беларусаў. Напрыклад, у арнаменце рушнікоў, посцілак, выцінанак. Арнамент – адзін са спосабаў захавання і трансляцыі этнакультурнай інфармацыі. Ён утрымлівае важную для этнасу міфалагічную інфармацыю і выступае адпаведным знакам міфапаэтычнай эпохі.

Базавым сімвалам у раслінным арнаменце з’яўляецца матыў Дрэва жыцця, які сімвалізаваў структуру Сусвету ў свядомасці старажытнага чалавека. Ручнікі з выявай Дрэва жыцця (мал. 2) сустракаюцца ў Браслаўскім, Верхнядзвінскім, Міёрскім, Шар-

*З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Кобрынскі (1979) і Маларыцкі раёны Брэсцкай вобласці (1981), Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці (1987).

каўшчынскім раёнах Віцебскай вобласці [5, с. 144–145]. Усе яны маюць складаныя кампазіцыі з выявамі дрэва і птушак, якія адлюстроўваюць старажытныя касмаганічныя ўяўленні чалавека аб структуры свету, іерархічных суадносінах яго частак – зямнога, нябеснага, падземнага свету. Вертыкальнай часткай кампазіцыі з'яўляецца выява ствала дрэва. У верхняй частцы кампазіцыі ручніка размяшчаюцца выявы птушак – прадстаўнікоў нябеснага свету. Характэрныя для такой вышыўкі стылізаваныя кветкі ў выглядзе васьміпялёсткавых разетак.



Мал. 2. Ручнік. Сусветнае дрэва з птушкамі. Канец XIX – пачатак XX ст. Браслаўскі раён, Віцебская вобласць. Музей старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі

Выява Сусветнага дрэва зафіксавана таксама на прасніцах (Брэсцкі раён), якія захоўваюцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (мал. 3).



Мал. 3. Прасніца. 1938 г., в. Радаць, Камянецкі раён, Брэсцкая вобласць. Музей старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі

Драўляная разьба прасніц перадае старажытную карціну Сусвету: выявы птушак і Сусветнага дрэва, шляху сонца на небасхіле, салярных матываў, якія прысутнічалі ў хаце ў зімовы час, калі жанчыны займаліся ткацтвам. Ва ўяўленнях беларусаў прасніца ўваходзіла ў касмалагічную сістэму абароны чалавека ад злых сіл.

Такім чынам, пры дапамозе Сусветнага дрэва выяўляюцца асноўныя зоны Сусвету: верхняя (неба), сярэдняя (зямля), ніжняя (падземнае царства); мінулае – сапраўднае – будучае (дзень – ноч, спрыяльны – неспрыяльны час года), у генеалагічным аспекце: продкі – цяперашняе пакаленне – нашчадкі. Асаблівая роля Сусветнага дрэва для міфапаэтычнай эпохі вызначаецца, у прыватнасці, тым, што яно выступае пасрэднікам паміж Сусветам (макракосмам) і чалавекам (мікракосмам) і з'яўляецца месцам іх перасячэння.

1. *Афанасьев, А. Н.* Древо жизни: Избранные статьи / А. Н. Афанасьев. – М. : Современник, 1982. – 464 с.

2. *Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А. Е. Богданович. – Гродно : Губернская типография, 1895. – III. – 186 с.

3. *Зеленин, Д. К.* Тотемы-деревья в сказаниях и обрядах европейских народов / Д. К. Зеленин. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1937. – 78 с. – (Труды Ин-та антропологии, этнографии и археологии / АН СССР ; т. 15, вып. 2).

4. *Иванов, Вяч. Вс.* Славянские языковые моделирующие семиотические системы (древний период) / Вяч. Вс. Иванов, В. Н. Топоров. – М. : Наука, 1965. – 246 с.

5. *Лабачэўская, В. А.* Повязь часоў – беларускі ручнік : альбом / В. А. Лабачэўская. – Минск : Беларусь, 2002. – 231 с.

6. *Топоров, В. Н.* Дерево Мировое / В. Н. Топоров // Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М., 1980. – Т. 1. – С. 398–406.

7. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / собр. и приведенные в порядок П. В. Шейном. – СПб. : Тип. Имп. Акад. наук, 1887–1902. – (Сборник Отделения русского языка и словесности императорской Академии наук). – Т. 1, ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – 1890. – 708 с.